Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы прарэктар БДУКМ
________________А. А. Корбут
«______» _____________ 2017 г.
Рэгістрацыйны № ВД-_____/вуч.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# АРГАНІЗАЦЫЯ МАСТАЦКАЙ ТВОРЧАСЦІ

*Вучэбная праграма*
*ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне*
*для спецыяльнасці 1-21 04 02 Мастацтвазнаўства (па напрамках),напрамку спецыяльнасці 1-21 04 02-05 Мастацтвазнаўства (інтэграванае),спецыялізацыі 1-21 04 02-05 01 Кампаратыўнае мастацтвазнаўства*

2017

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарту ОСВО 1-21 04 02-13 па спецыяльнасці 1-21 04 02 Мастацтвазнаўства (па напрамках) і вучэбнага плана па спецыялізацыі 1-21 04 02-05 01 Кампаратыўнае мастацтвазнаўства, рэг. № Д21-1-13/13 вуч. ад 27.06.13

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**
*Д. С. Скачкоў,* старшы выкладчык кафедры беларускай і сусветнай мастацкай культуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат мастацтвазнаўства;
*А. В. Пагоцкая*, выкладчык кафедры беларускай і сусветнай мастацкай культуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
*В. М. Ярмалінская,* загадчык аддзела тэатральнага мастацтвадзяржаўнай навуковай установы «Цэнтр даследаванняў беларускай мовы, культуры і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі», кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт;
*Г. А. Барвенава,* дацэнт кафедры рэжысурыабрадаў і свят установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат мастацтвазнаўства

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**
кафедрай беларускай і сусветнай мастацкай культуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 15 ад 26.05.2016);
прэзідыумам навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 5 ад 22.06.2016)

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адказны за выпуск: Д. С. Скачкоў

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна«Арганізацыя мастацкай творчасці» з'яўляецца важнай часткай прафесійнай падрыхтоўкі студэнтаў мастацкіх спецыяльнасцей. Выпускнікі ўніверсітэта культуры і мастацтваў павінны валодаць не толькі тэарэтычнымі ведамі ў галіне мастацкай культуры, але і практычнымі навыкамі ў арганізацыі мастацкай дзейнасці, мастацкай творчасці, падрыхтоўцы і правядзенні мастацкіх мерапрыемстваў. Галоўная ўвагапры асваенні вучэбнай дысцыпліны надаецца аваладанню методыкай арганізацыі пэўных мастацкіх мерапрыемстваў – конкурсаў, канцэртаў, выстаў, экскурсій з улікам спецыфікі аўдыторыі, інтарэсаў кожнага ўдзельніка і мэт, якія неабходна дасягнуць мерапрыемствам.

Засваенне адукацыйнай праграмы па вучэбнай дысцыпліне «Арганізацыя мастацкай творчасці» павінна забяспечыць фарміраванне наступных акадэмічных кампетэнцый:

АК-1.Валодаць і выкарыстоўваць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для рашэння тэарэтычных і практычных задач;

АК-4.Умець працаваць самастойна;

АК-5.Быць здольным параджаць новыя ідэі (крэатыўнасць);

АК-9.Умець вучыцца, павышаць сваю кваліфікацыю напрацягу ўсяго жыцця;

АК-12.Ведаць месца і ролю ў ім сваёй прафесійнай дзейнасці, праблемы і тэндэнцыі ўстойлівага развіцця.

Акрамя таго, студэнт павінен набыць наступныя сацыяльна-асобасныя кампетэнцыі:

САК-2.Быць здольным да сацыяльнага ўзаемадзеяння;

САК-3.Валодаць здольнасцю да міжасабовых камунікацый;

САК-6.Умець працаваць у камандзе.

Пасля вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Арганізацыя мастацкай творчасці» студэнт павінен валодаць наступнымі прафесійнымі кампетэнцыямі:

ПК-1.Займацца навукова-даследчай дзейнасцю ў галіне мастацтвазнаўства, педагогікі, арт-рэкламы ў сацыякультурнай сферы, у сродках масавай інфармацыі і інш.;

ПК-2.Аналізаваць і ацэньваць сабраныя звесткі;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ПК-4.Арганізоўваць пазнавальную і творчую дзейнасць вучняў рознага ўзросту як у межах вучэбнага працэсу, так і сродкамі пазакласнай работы;

ПК-6.Суадносіць нацыянальныя мастацкія школы, вызначаць месца і своеасаблівасць беларускага мастацтва ў сусветным мастацкім працэсе;

ПК-7.Набываць новыя веды, выкарыстоўваючы сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі;

ПК-8.Ацэньваць стан, тэндэнцыі і перспектывы развіцця мастацтва і культуры;

ПК-9.Прагназаваць, планаваць і ажыццяўляць інавацыйна-метадычную і мастацка-творчую дзейнасць устаноў мастацтва і культуры;

ПК-10.Выяўляць інтарэсы і педагагічныя патрэбы насельніцтва ў розных відах адпачынку;

ПК-11.Распрацоўваць сацыяльна-культурныя праграмы па арганізацыі вольнага часу ў канкрэтным мікрасоцыуме;

ПК-13.Арганізоўваць работу малых калектываў выканаўцаў для дасягнення пастаўленых мэт, планаваць фонды аплаты працы;

ПК-14.Кантраляваць і падтрымліваць працоўную і вытворчую дысцыпліну;

ПК-15.Складаць дакументацыю (графікі работ, інструкцыю, планы, заяўкі, дзелавыя лісты і да т.п.), а таксама справаздачную дакументацыю па ўстаноўленых формах.

*Мэтай вучэбнай дысцыпліны* з'яўляецца фарміраванне (на аснове ведаў па гісторыі і тэорыі мастацкай творчасці) арганізацыйна-педагагічных здольнасцей у студэнтаў як будучых арганізатараў разнастайных форм аматарскай мастацкай творчасці.

*Задачывучэбнай дысцыпліны* – фарміраванне ў студэнтаў прафесійнай сістэмы ведаў у галіне аматарскай мастацкай творчасці і выпрацоўка навыкаў арганізацыі разнастайных мастацкіх мерапрыемстваў (канцэрты, выставы, экскурсіі, конкурсы, фестывалі).

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнты павінны *ведаць:*

– гісторыю развіцця форм арганізацыі мастацкай творчасці ў Беларусі і Расіі ад вытокаў да сучаснасці;

– месца, ролю і функцыі мастацкай творчасці ў сістэме мастацкай культуры;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– спецыфіку арганізацыі педагагічнага і творчага працэсу ў выканальніцкай і аўтарскай мастацкай творчасці;

– матэрыяльна-тэхнічныя сродкі, неабходныя для забеспячэння мерапрыемстваў мастацкай творчасці;

– методыку і арганізацыю правядзення экскурсій, конкурсаў, выстаў,фестываляў мастацкай творчасці.

Студэнты павінны *ўмець:*

– арганізоўваць і праводзіць экскурсіі, выставы, конкурсы, фестывалі, святы, алімпіяды, майстар-класы, семінары, канферэнцыі і іншыя мерапрыемствы ў сферы мастацкай творчасці;

– ажыццяўляць культурнае і мастацкае выхаванне розных груп насельніцтва сродкамі мастацкай творчасці, фарміраваць духоўна-маральныя каштоўнасці і ідэалы;

– ствараць задуму мерапрыемства ў адпаведнасці з матэрыяльна-тэхнічнымі і кадравымі магчымасцямі;

– прыцягваць удзельнікаў да планавання і арганізацыі вольнага часу;

– працаваць у камандзе ў якасці выканаўцы і арганізатара;

– аналізаваць, абагульняць і распаўсюджваць вопыт прац аматарскіх калектываў мастацкай творчасці;

– распрацоўваць інфармацыйныя і метадычныя матэрыялы аб розных аспектах развіцця мастацкай творчасці;

– арыентавацца ў спецыяльнай літаратуры як па профілі, так і ў сумежных галінах мастацкай творчасці.

Студэнты павінны *валодаць:*

– катэгарыяльным апаратам у галіне мастацкай творчасці;

– навыкамі працы над разнастайнымі мастацкімі мерапрыемствамі (канцэрты, выставы, экскурсіі, конкурсы, фестывалі).

*Метады (тэхналогіі) навучання,*якія дакладна адпавядаюць мэце вывучэння дадзенай дысцыпліны – праблемнае навучанне (праблемнае выкладанне, часткова-пошукавы і даследчы метады); камунікатыўныя і інтэрактыўныя тэхналогіі (дыскусія, творчы форум, аналітычны агляд і інш.).

У мэтах пашырэння ведаў і практычных уменняў па арганізацыі мерапрыемстваў мастацкай творчасці рэкамендуецца наведваць святы, фестывалі, агляды, конкурсы, выставы і канцэрты.

Для кіравання вучэбным працэсам і арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці выкладчыкам прапаноўваецца выкарыс-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тоўваць рэйтынгавыя, крэдытна-модульныя сістэмы ацэнкі вучэбнай і даследчыцкай дзейнасці студэнтаў, варыятыўныя мадэлі кіравання самастойнай работай, вучэбна-метадычныя комплексы.

Вучэбным планам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Арганізацыя мастацкай творчасці»ўсяго прадугледжана 94 гадзіны, з якіх 36 гадзін – аўдыторныя заняткі. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: лекцыйных – 20 гадзін, практычныя (семінарскія) – 16 гадзін. Рэкамендаваныя формы кантролю ведаў – залік, экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## Уводзіны

Прадмет і задачы курса, яго ўзаемасувязь з курсамі педагогікі, мастацтвазнаўства і спецпрактыкума. Азначэнне паняцця «дзейнасць». Віды дзейнасці. Творчая і нятворчая дзейнасць. Разнавіднасці творчай дзейнасці. Мастацкая творчасць і яе спецыфічныя рысы. Этапы мастацкай творчай дзейнасці. Спецыфіка арганізацыі працэсу мастацкай творчасці. Творчая асоба. Здольнасці. Талент.

## Раздзел І. Гісторыя непрафесійнай мастацкай творчасці ў Беларусі і Расіі

### *Тэма 1. Гісторыя мастацкай творчасці Беларусі ад вытокаў да пачатку ХХ ст.*

Вытокі нацыянальнай мастацкай творчасці. Старажытныя абрадавыя ігрышчы, народныя гульні. Сувязь святочнай дзейнасці і рэлігійнага абраду. Славянскі пантэон. Каляндарны цыкл беларускіх народных свят. Святы пры княжацкіх дварах. Сямейна-абрадавая тэатралізаваная дзейнасць. Творчасць скамарохаў. Мядзведжыя забавы. Увядзенне хрысціянства і яго ўплыў на мастацкую творчасць беларусаў. Замена язычніцкіх свят на царкоўныя. Мастацкая творчасць у асяроддзі жыхароў Вялікага Княства Літоўскага. Тэатралізаваныя паляванні. Свецкія святы і ўрачыстасці. Музычная творчасць у народным, царкоўным і арыстакратычным асяроддзі. Мастацкая творчасць жыхароў Беларусі перыяду Рэчы Паспалітай. Культурна-дасугавая дзейнасць праваслаўных брацтваў.Роля езуітаў у развіцці адукацыі і культурнага дасугу жыхароў Беларусі. Школьны тэатр. Ажыццяўленне тэатральных пастановак. Рэпертуар і драматургія школьнага тэатра. Батлейка – беларускі лялечны тэатр (XVI–XIX стст.). Тыпы батлеек. Персанажы, сюжэты, выканаўцы батлеечнага тэатра. Дзейнасць прыватнаўласніцкіх тэатраў XVIII ст.: тэатры Радзівілаў, Сапегаў, М. Агінскага, А. Тызенгаўза, С. Зорыча. Аматарская мастацкая творчасць у Беларусі ў XIX ст. Народная музыка і музычныя інструменты XIX ст. Беларускія вечарынкі. «Першая беларуская трупа» І. Буйніцкага. Вандроўная трупа У. Галубка. Таварыствы прыгожых мастацтваў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 2. Гісторыя мастацкай творчасці Расіі ад вытокаў да пачатку XX ст.*

Вытокі рускай нацыянальнай мастацкай творчасці. Рытуальныя язычніцкія абрады і святы. Карагод. Дзейнасць скамарохаў. Народная драма. «Лодка», «Цар Максіміліян». Лялечны тэатр«Пятрушка». Царкоўны тэатр на Русі. Літургічныя драмы. Свецкі тэатр. «Камедыйная харомiна». Мастацкая творчасць сярод розных саслоўяў расійскага грамадства ў XVIII – пачатку XX ст.Культурны дасуг сялян. Балаганы. «Раёк».Культурныя арыентацыі ў мяшчанскім асяроддзі. Арганізацыя адпачынку і мецэнацтва ў купецкім асяроддзі. Дасугавыя заняткі дваранства. Святы і забавы пры Пятры І. Пятроўскія асамблеі. Паратэатральныя дзеі пры Пятры І. Школьны тэатр Славяна-грэка-лацінскай акадэміі. Дзейнасць Ф. Волкава. Вулічны маскарад «Урачыстая Мінерва». Прыгонны тэатр у Расіі XVIII ст. Непрафесійная мастацкая творчасць у Расіі XIX ст. Салоны і літаратурна-музычныя гасцёўні.Тэатры мініяцюр і тэатры вар’етэ Масквы і Пецярбурга 1910-х гг.

*Тэма 3. Гісторыя самадзейнай мастацкай творчасці Расіі і Беларусі ў XX ст.*

Народныя дамы, народныя тэатры, народныя ўніверсітэты, народныя гулянні. Асноўныя мерапрыемствы савецкай улады ў галіне мастацкай творчасці. Новыя культурна-асветніцкія ўстановы як цэнтры мастацкай творчасці. Чырвоныя куткі, жаночыя клубы, хаты-чытальні, паркі культуры і адпачынку. Палацы культуры і дамы культуры. Перасоўныя культурна-асветніцкія ўстановы: агітпавозкі, агітмашыны, агітпаязды. Арганізацыйная работа ў галіне мастацкай творчасці. Дамы народнай творчасці. Клубныя ўстановы. Хаты-чытальні як цэнтр палітычнай, асветніцкай і мастацкай дзейнасці народа. Формы аматарскай мастацкай творчасці 1920–1930-х гг.: вусны і жывы часопіс, «сінія блузы», агітстудыі, інсцэніроўкі, агіткалектывы, агітбрыгады, «чырвоныя рубахі». ТРАМы. Самадзейнае выяўленчае мастацтва.Масавыя народныя святы і відовішчы.Мастацкая творчасць партызан і насельніцтва Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Буйныя партызанскія калектывы. Жанры партызанскай мастацкай творчасці. Партызанскі фальклор. Мастацкая творчасць і патрыятызм. Аднаўленне культурна-асветніцкіх устаноў у пасляваенны перыяд. Рэарганізацыя клу-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

баў. Агляды мастацкай самадзейнасці. Стварэнне Міністэрства культуры СССР. Стварэнне сістэмы народных тэатраў. Падрыхтоўка спецыялізаваных кадраў для самадзейных калектываў. Развіццё самадзейнай мастацкай творчасці. Першы Усесаюзны фестываль самадзейнай творчасці (1975–1977). Шэфская дапамога аматарскім калектывам прафесійнымі. Стварэнне навукова-метадычных цэнтраў народнай творчасці.

## Раздзел II. Тэарэтычныя асновы арганізацыі мастацкай творчасці

### *Тэма 4. Мастацкая творчасць у сістэме мастацкай культуры*

Азначэнне паняццяў «мастацкая культура», «мастацтва». Мастацкая творчасць у прафесійнай і непрафесійнай сферы. Непрафесійная мастацкая творчасць як частка мастацкай культуры. Паняцці «вольны час», «дасуг», іх гістарычная абумоўленасць. Сутнасць і сацыяльна-культурная прырода дасугу. Мастацкая дзейнасць у межах вольнага часу, яе мэта, спецыфіка і супярэчныя праявы. Тыпалогія дзейнасці ў вольны час. Суб’ектна-аб’ектныя адносіны ў дасугавай дзейнасці. Пазнавальна-развіваючыя магчымасці вольнага часу. Сацыяльныя і культурныя функцыі вольнага часу. Аб’ём, структура і змест вольнага часу. Складаючыя часткідасугу і іх характарыстыка. Вольны час і культурнае фарміраванне асобы, выхаваўча-рэкрэацыйны патэнцыял вольнага часу. Святочны і паўсядзённы вольны час.

### *Тэма 5. Класіфікацыя мастацкай творчасці*

Паняцце класіфікацыі, патрабаванні да яе. Агульная характарыстыка падыходаў да класіфікацыі з’яў прафесійнай і непрафесійнай мастацкай творчасці. Жанрава-відавая характарыстыка мастацкай творчасці. Значэнне жанравай класіфікацыі. Класіфікацыя мастацкай творчасці па характары творчасці. Асаблівасці непрафесійнай мастацкай творчасці, арыентаванай на фальклор. Арыгінальная мастацкая творчасць. Класіфікацыя мастацкай самадзейнасці па сацыяльна-дэмаграфічнай прыкмеце, па форме арганізацыі сумеснай дзейнасці, па структуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 6. Сутнасць і спецыфіка аматарскай мастацкай творчасці*

Самадзейнасць і аматарства: тэрміналагічнае вызначэнне. Узнікненне і развіццё мастацкай аматарскай творчасці. Самадзейнасць як грамадска-гістарычная з'ява. Асаблівасці непрафесійнай мастацкай творчасці. Мастацкая самадзейнасць: азначэнне і прыкметы. Сутнасць, функцыі, жанры аматарскай творчасці. Мастацкая самадзейнасць і фальклор. Узаемадзеянне мастацкай самадзейнасці і прафесійнага мастацтва. Шматфункцыянальнасць непрафесійнай мастацкай дзейнасці. Аматарская дзейнасць як эксперыментальная, інавацыйная дзейнасць. Аналіз сучаснай мастацкай самадзейнасці Беларусі: стан, праблемы. Народныя калектывы і тэатры, агляды і фестывалі.

*Тэма 7. Фальклор і мастацкая творчасць*

Азначэнне фальклору, яго віды і функцыі. Формы бытавання фальклору, іх асаблівасці. Роля мастацкай творчасці ў захаванні, распаўсюджанні і ўзбагачэнні фальклорнай традыцыі. Паняцці «аўтэнтычны фальклор», «фальклорная стылізацыя», «фалькларызм», «другасны фальклор». Падыходы да апрацоўкі музычнага фальклору. Рэпертуар фальклорнага калектыву. Фальклорныя экспедыцыі. Фальклорны рух на сучасным этапе. Народныя мастацкія промыслы і рамёствы Беларусі. Работа з народнымі ўмельцамі.

*Тэма 8. Псіхалогія мастацкай творчасці*

Асноўныя прынцыпы псіхалогіі мастацтва. Метадалагічныя прынцыпы вывучэння мастацкай творчасці. Асабісты падыход. Працэс стварэння твораў мастацтва. Псіхалогія асобы творцы. «Творчае “Я”». Працэс ужывання ў вобраз. Перайманне. Прынцып ідэнтыфікацыі. Эмпатыя. Крэатыўнасць. Развіццё крэатыўнасці і таленту. Праблема мастацкай індывідуальнасці. Шлях ад ідэі да яе рэалізацыі. Мастацкая форма. Мастацкі вобраз. Узроўні мастацкай формы: «унутраны» і «знешні». Унутраная форма зместу: прадметны, эстэтычны і кампазіцыйны ўзроўні. Псіхалогія мастацкай творчасці розных відаў мастацтва.

*Тэма 9. Выканальніцкая і аўтарская мастацкая творчасць. Спецыфіка арганізацыі педагагічнага і творчага працэсу*

Выканальніцкая мастацкая творчасць. Выканальніцкая мастацкая дзейнасць у аматарскім і прафесійным мастацтве. Асаб-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

лівасці вырашэння вучэбна-творчых, адукацыйных задач у аматарскіх выканальніцкіх калектывах. Формы арганізацыі работы, патрабаванні да рэпертуарнай і канцэртнай дзейнасці. Рэпертуар і патрабаванні да яго. Рэпертуарная палітыка. Прынцыпы адбору матэрыялу для выканання. Разнавіднасці аўтарскіх аб’яднанняў мастацкай творчасці. Кінааматарства. Фотааматарства. Літаратурныя аматарскія аб’яднанні. Разнавіднасці літаб’яднанняў. Аматарская «аўтарская» песня. Аматарская выяўленчая творчасць. Дэкаратыўнае мастацтва аматараў. Тэатральная самадзейнасць.

### *Тэма 10. Характарыстыка ўстаноў мастацкай аматарскай творчасці*

Кіраўніцтва мастацкай творчасцю ва ўстановах культуры. Класіфікацыя і характарыстыка ўстаноў культуры (палацы і дамы культуры, установы дадатковай адукацыі дзяцей і падлеткаў – палацы і дамы творчасці, школы мастацтваў, клубы). Установы мастацтваў і іх характарыстыка. Універсітэты і школы культуры. Новыя тыпы ўстаноў культуры ў Рэспубліцы Беларусь. Цэнтры рамёстваў. Дамы народнай творчасці. Падрыхтоўка і павышэнне кваліфікацыі кадраў, кіраўнікоў самадзейнай мастацкай творчасці. Сістэма метадычнага кіраўніцтва самадзейнай мастацкай творчасцю.Клубы па інтарэсах, аматарскія аб’яднанні: арганізацыя іх работы.Мастацкія гурткі, студыі, школы, калектывы, іх жанравыя асаблівасці. Роля культурна-дасугавых устаноў у арганізацыі мастацкай творчасці.

### *Тэма 11. Аматарскі калектыў мастацкай творчасці*

Сутнасць і спецыфічныя асаблівасці калектыву аматарскай творчасці. Стадыі і законы развіцця калектыву народнай мастацкай творчасці. Паняцце, асноўныя і спецыфічныя прыкметы самадзейнага калектыву. Прыкметы калектыву – наяўнасць адзінай мэты, сумесных дзеянняў па яе ажыццяўленні, кваліфікаванага кіраўніка, органаў самакіравання. Тыпы самадзейных калектываў. Спалучэнне грамадскіх і асабістых памкненняў і інтарэсаў удзельнікаў самадзейнага калектыву. Фарміраванне грамадскай думкі ў самадзейным калектыве. Традыцыі і іх значэнне ў развіцці калектыву. Тэхналогія стварэння і арганізацыі працы калектыву самадзейнай творчасці. Стадыі і законы развіцця калектыву, метады планавання і ўліку яго дзейнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Удзельнікі мастацкай самадзейнасці. Матывы прыходу ўдзельнікаў у мастацкія гурткі. Выхаваўчая работа ў самадзейных мастацкіх калектывах. Роля кіраўніка калектыву. Стылі кіраўніцтва ў мастацкім калектыве.

## Раздзел III. Методыка арганізацыі разнастайных форм мастацкай творчасці

### *Тэма 12. Метадычныя асновы арганізацыі канцэртаў, аглядаў свят, конкурсаў, выстаў, фестываляў мастацкай творчасці, экскурсій*

Методыка падрыхтоўкі і арганізацыя правядзення выставы. Этапы, віды. Класіфікацыя выстаў (па статуце, па прадмеце і шыраце тэматыкі, па часе правядзення, па частаце паўтору, па месцы правядзення). Тыпы выстаў (на вольным паветры, выставы-кірмашы, мабільныя выставы, пераносныя, спецыяльныя). Тэхналогія афармлення экспазіцыі выставы народнай мастацкай творчасці. Арганізацыя, методыка падрыхтоўкі і правядзення канцэрта. Этапы і віды.

Тэхналогія арганізацыі, методыка падрыхтоўкі і правядзення конкурсных мерапрыемстваў (фэстаў, конкурсаў). Этапы падрыхтоўкі і правядзення фестывалю.Формы конкурсных мерапрыемстваў: спаборніцтва (турнір), алімпіяда, выстава-конкурс, конкурс прац, конкурс выканаўцаў (салістаў, ансамбляў, масавых калектываў), агляд-конкурс, тэматычны конкурс. Асноўныя этапы арганізацыі і правядзення конкурснага мерапрыемства. Значэнне фестывальных і конкурсных форм у развіцці аматарскай мастацкай творчасці.

Метадалогія, тэорыя і практыка экскурсіі. Агульная і прыватная экскурсійная методыкі. Класіфікацыя экскурсій па тэматыцы, месцы правядзення, спосабе руху, складзе экскурсантаў. Паказ і аповед як асноўныя часткі экскурсіі. Паслядоўнасць падрыхтоўкі экскурсіі. Выяўленне і вывучэнне экскурсійных аб’ектаў. Састаўленне маршруту і распрацоўка тэксту экскурсіі. Афармленне метадычнай распрацоўкі экскурсіі. Правядзенне пробнай экскурсіі і яе зацвярджэнне. Прыёмы правядзення экскурсіі. Размяшчэнне экскурсійнай групы. Паслядоўнасць паказу, сродкі паказу аб’ектаў экскурсіі. Выкарыстанне наглядных дапаможнікаў. Прыёмы аповеду экскурсавода: экскурсійная даведка, характарыстыка аб’екта, тлумачэнне, каментаван-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

не. Рух у экскурсіі. Прыёмы рэканструкцыі, лакалізацыі падзей, параўнання, літаратурнага мантажу, цытавання. Культура мовы экскурсавода. Кантакт экскурсавода з групай. Тэхнічныя сродкі на экскурсіях.

*Тэма 13. Тэхналогія правядзення мастацкага мерапрыемства*

Сцэнарна-рэжысёрскія тэхналогіі і асноўныя творчыя метады рэжысуры мастацкіх праграм. Метады тэатралізацыі. Гульнявы метад. Праца рэжысёра над нумарам. Выканальніцкая праца над нумарам. Паняцце, тэхналогія і спецыфіка мастацка-публіцыстычных праграм. Асаблівасці тэатралізаванага тэматычнага вечара. Культурна-забаўляльныя праграмы: сучасныя выгляды і формы. Тэатралізаваныя гульнявыя праграмы. Методыка тэатралізацыі гульнявых праграм. Тэатралізаваныя конкурсныя праграмы. Вечары адпачынку. Масавыя культурна-забаўляльныя праграмы. Святы. Фестывалі мастацкай творчасці. Спартыўныя алімпіяды. Народныя гулянні. Карнавалы. Карнавальныя шэсці. Масава-гульнявыя карнавальныя дзеянні. Драматургія мастацкай праграмы. Кампазіцыйная пабудова сцэнарыя. Сцэнарны ход і прыём. Сродкі стварэння мастацкай выявы. Асноўныя этапы працы над сцэнарыем. Распрацоўка задумы. Ідэйна-тэматычнае абгрунтаванне і сцэнарна-рэжысёрскі ход. Сцэнарная праца па адборы і арганізацыі матэрыялу. Мантаж. Эпізод. Прынцыпы стварэння і спосабы ўвасаблення літаратурных мантажоў і кампазіцый. Увага як найважнейшы элемент акцёрскага майстэрства. Развіццё творчай фантазіі. Пошукі вобразнасці ў характары ролі. Праца над роллю. Сродкі мастацкай выразнасці. Пастановачны план. Рэпетыцыйны працэс. Музычнае афармленне мастацкага мерапрыемства. Музычная драматургія. Сцэнаграфія і яе месца ў мастацтве. Методыка працы над складаннем мастацкага афармлення праграмы, рэалізацыя гэтай задумы ў матэрыяле. Выразныя сродкі сцэнаграфіі. Сцэнаграфічныя матэрыялы і канструкцыі. Тэхнічныя сродкі ў мастацкім мерапрыемстве: святло, гук, праекцыя.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

| Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | КСР | Форма кантролю |
|---|---|---|---|---|
| | лекц. | практ. | | |
| **Уводзіны** | 2 | | | |
| **Раздзел І. Гісторыя непрафесійнай мастацкай творчасці ў Беларусі і Расіі** | | | | |
| Тэма 1. Гісторыя мастацкай творчасці Беларусі ад вытокаў да пачатку XX ст. | 2 | 2 | | |
| Тэма 2. Гісторыя мастацкай творчасці Расіі ад вытокаў да пачатку XX ст. | 2 | 2 | | |
| Тэма 3. Гісторыя самадзейнай мастацкай творчасці Расіі і Беларусі ў XX ст. | | 2 | | |
| **Раздзел II. Тэарэтычныя асновы арганізацыі мастацкай творчасці** | | | | |
| Тэма 4. Мастацкая творчасць у сістэме мастацкай культуры | 1 | | | |
| Тэма 5. Класіфікацыя мастацкай творчасці | 1 | | | |
| Тэма 6. Сутнасць і спецыфіка аматарскай мастацкай творчасці | 2 | | | |
| Тэма 7. Фальклор і мастацкая творчасць | 2 | | | |
| Тэма 8. Псіхалогія мастацкай творчасці | 2 | | | |
| Тэма 9. Выканальніцкая і аўтарская мастацкая творчасць. Спецыфіка арганізацыі педагагічнага і творчага працэсу | 2 | | | |
| Тэма 10. Характарыстыка ўстаноў мастацкай аматарскай творчасці | 1 | | | |
| Тэма 11. Аматарскі калектыў мастацкай творчасці | 1 | | | |
| **Раздзел III. Методыка арганізацыі разнастайных форм мастацкай творчасці** | | | | |
| Тэма 12. Метадычныя асновы арганізацыі канцэртаў, аглядаў свят, конкурсаў, выстаў, фестываляў мастацкай творчасці, экскурсій | | 2 | 4 | абарона праекта |
| Тэма 13. Тэхналогія правядзення мастацкага мерапрыемства | | 4 | 2 | абарона праекта |
| **Усяго…** | **18** | **12** | **6** | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*


*1. Аксюцік, М.І.* Сацыяльна-культурная дзейнасць : вучэб.-метад. дапам. / М.І. Аксюцік. – Мінск : ІСВ, 2003. – 101 с.

*2. Алексеев, Э.Е.* Фольклор в контексте современной культуры / Э.Е. Алексеев. – М. : Сов. композитор, 1988. – 238 с.

*3. Бакланова, Т.И.* Организация и научно-методическое обеспечение художественной самодеятельности : учеб. пособие / Т.И. Бакланова. – М. : б.и., 1992. – 102 с.

*4. Ермолаева-Томина, Л.Б.* Психология художественного творчества : учеб. пособие для вузов / Л.Б. Ермолаева-Томина. – М. : Акад. проект, 2003. – 304 с.

*5. Жарков, А.Д.* Организация культурно-просветительской работы : учеб. пособие для студентов ин-тов культуры / А. Д. Жарков. – М. : Просвещение, 1989. – 236 с.

*6. Каргин, А.С.* Воспитательная работа в самодеятельном художественном коллективе : учеб. пособие для студентов культ.-просвет. фак. вузов культуры и искусств / А.С. Каргин. – М. : Просвещение, 1984. – 222 с.

*7. Каргин, А.С.* Самодеятельное художественное творчество : история, теория, практика : учеб. пособие для студентов и аспирантов вузов культуры и искусств / А.С. Каргин. – М. : Высш. шк., 1988. – 270 с.

*8.* Культурно-досуговая деятельность: учебник/ под науч. ред. А.Д. Жаркова и В.М. Чижикова. – М. : МГУК, 1998. – 462 с.

*9.* Народная художественная культура : учебник для студентов вузов культуры и искусств / Т.И. Бакланова [и др.] ; под ред. Т.И. Баклановой, Е.Ю. Стрельцовой. – М. : [б. и.], 2000. – 412 с.

*10.* Самодеятельное художественное творчество в СССР : очерки истории, конец 1950-х – начало 1990-х годов / редкол.: К.Г. Богемская [и др.]. – СПб. : Гос. ин-т искусствознания, 1999. – 468 с.

*11. Соколовский, Ю.Е.* Коллектив художественной самодеятельности : вопросы теории и практики / Ю.Е. Соколовский. – М. : Сов. Россия, 1984. – 155 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*12. Стрельцова, Е.Ю.* Народное художественное творчество как объект научного исследования / Е.Ю. Стрельцова. – М. : МГУКИ, 2003. – 248 с.

*13. Шаура, Р.Ф.*Самадзейнае выяўленчае мастацтва Беларусі: жывапіс, графіка, скульптура / Р.Ф. Шаура. – Мінск : Навука і тэхніка, 1995. – 250 с.

*Дадатковая*

*1. Александрова, Н.В.*Ассоциативность художественного мышления : учеб. пособие / Н.В. Александрова. – Минск : [б. и.], 2004. – 201 с.

*2. Аляхновіч, А.М.*Тыпы фалькларызму ў сучаснай харавой самадзейнасці : дапам. для кіраўнікоў і ўдзельнікаў самадзейных калектываў / А.М. Аляхновіч, Г.М. Аладаў. – Мінск : [б. в.], 1990. – 48 с.

*3. Бакланова, Т.И.* Самодеятельное художественное творчество в СССР : учеб. пособие / Т.И. Бакланова. – М. : МГИК, 1986. – 79 с.

*4. Волков, И.П.* Воспитание творчеством / И.П. Волков. – М.: Знание, 1989. – 159 с.

*5. Жаркова, Л.С.* Деятельность учреждений культуры: учеб. пособие / Л.С. Жаркова. – 2-е изд. – М. : МГУКИ, 2000. – 179с.

*6. Кузьмініч, М.Л.*Мастацкая творчасць : вучэб. дапам. для студэнтаў і аспірантаў выш. навучальных устаноў культуры і мастацтва / М.Л. Кузьмініч. – Мінск : Беларус. навука, 1998. – 141 с.

*7. Кривцун, О.А.*Психология искусства : учеб. пособие / О. А. Кривцун. – М. : Высш. шк., 2009. – 447 с.

*8. Макарава, А.А.*Аматарская мастацкая творчасць: стан і тэндэнцыі развіцця / А.А. Макарава // Прырода, чалавек, культура: праблемы гармоніі : матэрыялы навук. канф., Мінск, 25–26 сак.2003 г. : у 2 ч. – Мінск, 2003. – Ч. 2. – С. 420–427.

*9. Мурашко, В.Г.*Коллективы любительского художественного творчества в современной социокультурной ситуации / В. Г. Мурашко // Сацыяльна-педагагічная работа. – 2010. – № 9. – С. 21–25.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*10. Петрушин, В.И.*Психология и педагогика художественного творчества : учеб. пособие для вузов / В.И. Петрушин. – Изд. 2-е. – М. : Акад.проект : Гаудеамус, 2008. – 490 с.

*11. Пятровіч, С.А.*Народныя тэатры Беларусі / С.А. Пятровіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1966. – 205 с.

*12. Сивурова, Л.П.*Фестивали народного художественного творчества / Л.П. Сивурова // Арт-менеджмент как вид управленческой деятельности : сб. ст. / Белорус. гос. ун-т культуры и искусств. – Минск, 2011. – С. 137–145.

*13. Смирнова, Е.И.* Теория и методика организации самодеятельного творчества трудящихся в культурно-просветительных учреждениях / Е.И. Смирнова. – М. : Просвещение, 1983. – 191 с.

*14. Сохар, Ю.М.*Жывая крыніца : тэатральная самадзейнасць на сучасным этапе / Ю.М. Сохар. – Мінск : Навука і тэхніка, 1983. – 69 с.

*15. Цукерман, В.С.* Сущность, структура и основные характеристики художественной самодеятельности: учеб. пособие / В.С. Цукерман. – Челябинск : Просвещение, 1984. – 55 с.

*16. Чистов, К.В.* Народные традиции и фольклор. Очерки теории / К.В. Чистов. – Л. : Наука, 1986. – 235 с.

*17. Чижиков, В.М.* Методическое обеспечение КДД / В. М. Чижиков. – М. : Моск. гос. ин-т культуры, 1991. – 142 с.

*18. Шкурин, В.Н.* Неформальные молодежные объединения / В.Н. Шкурин. – М. : ВНМЦ НТ и КПР МК СССР, 1990. – 140 с.

*19.*Художественная самодеятельность : вопросы развития и руководства / редкол.: И. Б. Закшевер, А. С. Кабанов, В. Ф. Чеснокова. – М. : [б. и.], 1980. – 151 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Пералік рэкамендаваных сродкаў дыягностыкі

Для дыягностыкі прафесійных кампетэнцый, выяўлення ўзроўню навучальных дасягненняў студэнтаў рэкамендуецца выкарыстоўваць наступны інструментарый:

– метады вуснай дыягностыкі (апытанне, гутаркі, дыскусіі, аналіз творчых работ, залік, экзамен);

– метады практычнай дыягностыкі (распрацоўка і ўдзел у арганізацыі мастацкіх мерапрыемстваў; выкананне вучэбна-творчых заданняў выкладчыкаў).

## Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай работы студэнтаў

Самастойная работа студэнтаў уключае напісанне рэфератаў па вывучаемых тэмах, а таксама самастойнае наведванне разнастайных мастацкіх мерапрыемстваў (канцэрты, выставы, вечары, конкурсы, фестывалі) ці прагляд адпаведнага аўдыявізуальнага матэрыялу.

Кантралюемая самастойная работа студэнтаў уключаерас-працоўку і абарону самастойных творчых праектаў па стварэннімастацкага нумара, гульнявой праграмы, культурна-забаўляльнай праграмы, тэматычнага вечара, вечара адпачынку, выставы, конкурсу, экскурсіі, фестывалю, карнавалу, свята. Вынікі самастойнай працы афармляюцца ў пісьмовым выглядзе, кантралююцца выкладчыкам і ўлічваюцца пры атэстацыі студэнта.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

# АРГАНІЗАЦЫЯ МАСТАЦКАЙ ТВОРЧАСЦІ

*Вучэбная праграма*
*ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне*
*для спецыяльнасці 1-21 04 02 Мастацтвазнаўства (па напрамках),напрамку спецыяльнасці 1-21 04 02-05 Мастацтвазнаўства (інтэграванае),спецыялізацыі 1-21 04 02-05 01*
*Кампаратыўнае мастацтвазнаўства*

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар А. У. Гіцкая

Падпісана ў друк 2017. Фармат 60x84 $^1/_{16}$.
Папера офісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 1,11. Ул.-выд. арк. 0,75. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ